# ОРША – ЮБІЛЕІ 2023 ГОДА

**400 год** з часу заснавання Куцеінскага Свята-Богаяўленскага мужчынскага манастыра (1623).




Свята-Богаяўленскі сабор Куцеінскага манастыра. Канец XIX ст.

**375 год** з часу адкрыцця ў Куцеінскім Свята-Богаяўленскім мужчынскім манастыры брацкай школы (1648).

**150 год** з часу закладкі ў Оршы гарадскога парка (1873).



У гарадскім парку.

**125 год** з часу заснавання ў Оршы друкарні Х. Іосялевіча (1898).

**125 год** з часу пабудовы мураванай Свята-Ільінскай царквы (1898).



Свята-Ільінская царква.

**100 год** з дня нараджэння Віктара Аляксандравіча Грамыкі (1.1.1923-10.7.2019), беларускага жывапісца, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага мастака Беларусі, ганаровага акадэміка НАН РБ, прафесара. У 1920-х-пачатку 1940-х гг. жыў у Оршы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, аўтар кнігі ўспамінаў "Вясёлка над дарогай". Імем Грамыкі названа Аршанская мастацкая галерэя. Ганаровы грамадзянін Аршанскага раёна (2018).



В.А. Грамыка.

**100 год** з дня нараджэння Антона Сцяпанавіча Юрчанкі (17.1.1923-9.5.1994), Героя Савецкага Саюза (1945), удзельніка вызвалення Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (разам з Я.А. Макеевым выратаваў чыгуначны мост цераз р. Дняпро ў Оршы), ганаровага грамадзяніна Оршы (1969).



**75 год** з часу адкрыцця ў Оршы Мемарыяльнага музея Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава (1948).




Будынак музея (да 2006 г.).

**50 год** з часу ўстанаўлення пабрацімскіх сувязей паміж Оршай і французскім горадам Воз-ан-Вленам (1973).



Вуліца Воз-ан-Влен у Оршы.

**25 год** з часу правядзення ў Оршы 5-га Рэспубліканскага свята беларускага пісьменства (5-6.9.1998).



Урачыстае шэсце. 5 верасня 1998 г.

**Падрыхтаваў Віктар Лютынскі**